**Юля Шарова**

# РАЗЬВІЦЬЦЁ Й ПЭРСПЭКТЫВЫ ВАЛЮТНА-ФІНАНСАВЫХ АДНОСІНАЎ БЕЛАРУСІ Й РАСІІ

## Перадумовы фінансавага крызысу 1992-1993 гадоў

З распадам Савецкага Саюзу Беларусь сутыкнулася зь неабходнасьцю праводзіць самастойную грашова-крэдытную палітыку, да чаго кіраўніцтва краіны было абсалютна не падрыхтавана. Між тым, праблемы, якія насьпявалі цягам доўгіх гадоў, якраз напярэдадні распаду СССР надзвычай абвастрыліся: гаспадарка была неэфэктыўнай і стратнай, буйныя прамысловыя прадпрыемствы не прыносілі прыбыткаў і патрабавалі рэфармаваньня. У выніку саюзны бюджэт імкліва спусташаўся: у яго не паступалі рэальныя і “жывыя” грошы. Тым часам усе заробкі выплачваліся своечасова і ў поўным аб’ёме.

У апошнія 4 гады існаваньня СССР адбывалася нарошчваньне грашовых прыбыткаў насельніцтва пры агульным спадзе вытворчасьці. Выкарыстоўваліся, паводле выразу расійскага эканаміста Яўгена Ясіна, “сапсаваныя эканамічныя мэханізмы”, якія прыводзілі да таго, што людзям плацілі грошы, а яны нікуды не маглі іх падзець, акрамя як панесьці ў ашчадную касу. Штогод з часоў абвяшчэньня перабудовы грашовыя прыбыткі насельніцтва расьлі ад 9 да 13% пры росьце вытворчасьці 1,5—2%.

Рэч у тым, што шматлікія прадпрыемствы атрымалі пасьля 1985 году некаторую свабоду, хоць захоўваліся асноўныя прынцыпы каманднa-адміністрацыйнай гаспадаркі. Гэтак, прадпрыемствам дазволілі выходзіць па-за межы фіксаванага фонду заробкаў і самім вызначаць стаўкі заработнай платы. Натуральна, што ў варунках спаду вытворчасьці й павелічэньня грашовай масы пры захаваньні цэнаў на ранейшым узроўні ўзьнік дэфіцыт тавараў. Паліцы крамаў спустошваліся, і людзі проста не маглі патраціць атрыманыя заробкі, таму лішкі грошай яны клалі на ашчадныя кніжкі ў надзеі празь некаторы час атрымаць з гэтага нейкія прыбыткі. З гэтых самых грошай яны, фактычна, і атрымлівалі ад дзяржавы свае наступныя заробкі.

Трэба згадаць таксама ўведзеную ў 89—90 гадох карткава-талённую сыстэму: гэткім чынам кіраўніцтва СССР хацела штучна ліквідаваць дэфіцыт тавараў. Ува ўрадзе вызначаліся нормы спажываньня прадуктаў ды колькасьць пэўных прамысловых тавараў на душу насельніцтва. Гэтак, узімку адзін чалавек ня мог набыць у краме больш за кіляграм цукру на месяц. На





адну жанчыну прыпадала ня болей за 6 пар калгот у год. Талёны на нехарчовыя тавары зьмяшчаліся ў адмысловых купонных кніжках, у якіх пазначаліся ўсе зьвесткі пра ўладальніка кніжкі, часам нават уклейваўся ягоны фатаздымак.

Паралельна адбывалася фінансавае сілкаваньне вялікіх і стратных прадпрыемстваў з боку дзяржавы, на што зь бюджэту ішлі велізарныя сродкі. Гэта таксама стварала адпаведныя праблемы. Летам 1991 году 80% актываў Ашчаднага банку СССР было накіравана на пакрыцьцё бюджэтнага дэфіцыту, але разам з тым банк павінен быў падрыхтавацца да выплаты насельніцтву працэнтаў па ўкладах і іх пагашэньні. Банк жа ня быў гатовы да гэтага, бо ўсе ўклады насельніцтва ішлі на фінансаваньне бюджэтнага дэфіцыту.

Ува ўмовах павышанага попыту на тавары немінуча мусілі ўзрасьці цэны, але “адпускаць” іх саюзнае кіраўніцтва не сьпяшалася. Урэшце, цэны “сарваліся” самі па сабе: першае іх заўважнае падвышэньне адбылося ўвесну 1991 году, хоць фармальна лібэралізацыя цэнаў не была абвешчаная. Нягледзячы на іх падвышэньне, раўнавагі паміж колькасьцю грошай у абарачэньні й колькасьцю тавараў дасягнуць не ўдалося. Гэтаму паспрыяла й тое, што ў тым жа 1991 г. у кожнай саюзнай рэспубліцы, у тым ліку і ў Беларусі, утвараліся асобныя, аўтаномныя ад Масквы эмісійныя цэнтры — рэспубліканскія цэнтральныя банкі, якія мелі права самастойна ажыцьцяўляць выпуск у абарачэньне савецкіх рублёў у адпаведнасьці з патрэбамі сваёй рэспублікі.

Становішча пагоршылася пасьля развалу Саюзу пры канцы 1991 г. Заробкі сталі выплачваць нерэгулярна, заводы спыняліся — іх не было за што фінансаваць. Зразумеўшы, што банкаўскія ўклады абясцэньваюцца, насельніцтва пабегла забіраць свае грошы, і гэта канчаткова падарвала фінансавую сыстэму новых незалежных дзяржаваў. У Расіі з 2 студзеня 1992 году была абвешчаная лібэралізацыя цэнаў, у выніку чаго толькі за год яны ўзрасьлі ў 26 разоў.

Для звыклага да стабільнасьці савецкага насельніцтва гэта стала сапраўдным шокам, незадаволенасьць дзеяньнямі ўладаў расла. А самі ўлады ня ведалі, што ім рабіць. Лепшая сытуацыя назіралася ў прыбалтыйскіх рэспубліках: яны адразу пасьля свайго выхаду з СССР увялі ўласныя нацыянальныя валюты, і таму праблемы, зьвязаныя зь бескантрольнай эмісіяй савецкіх рублёў, іх не закранулі. Апрача гэтага, яны пазьбеглі завялікага абясцэньваньня банкаўскіх укладаў, даўгавых абавязаньняў дзяржавы і г.д. Але засталіся яшчэ 12 незалежных дзяржаваў, што самастойна выпускалі ў абарачэньне савецкія рублі, павелічэньне колькасьці якіх падштурхоўвала цэны ўверх. Быў адзіны сродак выйсьця зь фінансавага крызысу — уводзіць свае ўласныя валюты, як Літва, Латвія й Эстонія. Акурат гэтак у рэшце рэшт і адбылося.

## Першая спроба аб’яднаньня грашовых сыстэмаў Беларусі й Расіі

Увядзеньне ўласнай нацыянальнай валюты стала ў той час ня столькі пытаньнем палітычнай незалежнасьці, колькі гарантыяй абароны ўнутранага рынку. Але шматразовыя прапановы Нацбанку аб увядзеньні нацыянальнай грашовай адзінкі не знаходзілі падтрымкі. Вярхоўны Савет 12-га скліканьня ўсяляк супраціўляўся выхаду Беларусі з рублёвай зоны.

Правобраз беларускай валюты зьявіўся ў траўні 1992 году: у абарачэньне паступаюць гэтак званыя “зайчыкі”, шматразовыя купоны з выявамі зьвяроў. Першапачаткова меркавалася, што гэтымі грашыма будуць аплачвацца толькі харчы, тавары, вытворчасьць якіх датавалася зь дзяржбюджэту, а таксама некаторыя дэфіцытныя тавары. Прадугледжвалася і тое, што “зайчыкі” стануць пераходнай грашовай адзінкай, пасьля меў быць уведзены беларускі талер — нацыянальная валюта, якая гэтак і засталася ў праекце. Падобная сытуацыя назіралася і ўва Ўкраіне, дзе таксама пэўны час ролю разьліковага білету выконвалі купоны, замененыя ў рэшце рэшт на грыўні.

У 1992 годзе Расія ўвяла сваю нацыянальную валюту — расійскі рубель, які, што досыць парадаксальна, меў хаджэньне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусі. Рубель “растраіўся”: стаў савецкім, расійскім і беларускім. Прычым замацаваць пазыцыі апошняга кіраўніцтва краіны не сьпяшалася, бо фармальнае існаваньне рублёвай зоны вельмі задавальняла беларускае кіраўніцтва. Расійскі рубель дазваляў праводзіць шматлікія валютныя спэкуляцыі. У наяўных разьліках ён быў прыраўнаваны да беларускага рубля ў суадносінах адзін да аднаго. Але ў безнаяўным абарачэньні курс беларускага рубля быў удвая ніжэйшым. Таму вельмі выгодным было акумуляваць вялікія сумы расійскіх рублёў у Беларусі, вывозіць іх у Расію, класьці там на рахунак ды пераводзіць безнаяўна назад у Беларусь — выходзіла ўдвая большая сума. Можна меркаваць, што першыя беларускія капіталы рабіліся акурат гэткім чынам.

Толькі ў жніўні 1993 году зьявіўся праект пастановы Нацбанку, згодна зь якой беларускі рубель абвяшчаўся адзіным плацежным сродкаў на тэрыторыі краіны. Усе разьлікі прадпрыемстваў у замежнай валюце забараняліся. Зрэшты, пастанова нарадзілася з падачы Масквы: 15 чэрвеня таго ж году расійскі ўрад накіраваў у Менск адмысловую тэлеграму, у якой прапаноўваў кіраўніку беларускай дзяржавы Станіславу Шушкевічу, прэм’ер-міністру Вячаславу Кебічу і старшыню праўленьня Нацбанку Станіславу Багданкевічу вызначыцца — праводзіць адзіную з Масквой грашова-крэдытную палітыку ці пераходзіць на ўласную валюту зь 1 ліпеня 1993 г. Напярэдадні Расія спыніла хаджэньне савецкіх рублёў.

Пасьля выхаду Расіі з рублёвай зоны беларускаму Нацбанку нічога не заставалася, як прызнаць “зайчыкаў” адзіным плацежным сродкам. Варта заўважыць, што Расія выйшла з рублёвай зоны ў парушэньне Белавескіх дамоўленасьцяў, якія прадугледжвалі захаваньне савецкага рубля. З таго моманту аб’яднаньне грашовых сыстэмаў з Расіяй робіцца “блакітнай марай” беларускага кіраўніцтва. У тым жа 1993 годзе прэм’ер Кебіч пачаў перамовы з Масквой аб такім аб’яднаньні, якое павінна было адбыцца ўжо 1 студзеня 1994 году. Аднак нічога падобнага ня здарылася.





Незадоўга да прэзыдэнцкіх выбараў, 12 красавіка 1994 году, Кебічу ўсё ж удалося падпісаць дамову пра грашовае аб’яднаньне з Расіяй. Згодна зь ім, Цэнтральны банк Расіі рабіўся цэнтрам валютнай эмісіі, а Беларусь павінна была ўзгадняць сваю фіскальную і грашовую палітыку з Расіяй.

Дамова парушала палажэньні Асноўнага закону Беларусі, але прэм’ер Кебіч у папулісцкіх перадвыбарных мэтах пайшоў на гэта. Урэшце часткі расійскай палітычнай эліты ўдалося заблякаваць яе выкананьне: ужо ў верасьні 1994 году, пасьля абраньня А. Лукашэнкі прэзыдэнтам, расійскі бок заявіў новаму кіраўніку, што грашовага аб’яднаньня ў найбліжэйшы час ня будзе.

Што да пытаньня разьвіцьця беларускай валютна-фінансавай сыстэмы, то эканаміст Валер Дашкевіч вылучае ў разьвіцьці стратэгіі й мэтадаў грашова-крэдытнага й валютнага рэгуляваньня ў Беларусі тры асноўныя этапы.

Першы этап — гэта пэрыяд пераходу ад сыстэмы сацыялістычнага дзяржаўнага разьмеркаваньня ўсіх унутраных грашовых рэсурсаў і валютных паступленьняў да фармаваньня рублёвага й валютнага рынкаў. Гэта пэрыяд з 1990 па 1994 год. Тады былі прынятыя асноўныя нарматыўныя дакумэнты, якія рэглямэнтавалі функцыянаваньне ўнутранага валютнага рынку і ўвядзеньне нацыянальнай грашовай адзінкі. У сакавіку 1993 году пачынае сваю працу Міжбанкаўская валютная біржа, а ў кастрычніку 1994 году беларускі рубель быў афіцыйна прызнаны ў якасьці адзінага плацежнага сродку на тэрыторыі краіны. У гэтыя ж гады краіна стала чальцом МВФ (адбылося гэта ў 1992 годзе) і атрымала першы транш крэдыту па мэханізьме сыстэмных трансфармацыяў — СТФ (люты 1993 г.).

Неабходнасьць рынкавых рэформаў у эканоміцы, уключаючы грашова-крэдытную палітыку, тады ніхто не аспрэчваў, але, паводле Валера Дашкевіча, “зьявіліся першыя сумнеўныя рысы ў спосабах правядзеньня гэтых рэформаў. ...У беларускім парлямэнце і ўрадзе сфармавалася моцнае аграрна-прамысловае лобі, якое навязвала краіне ўласную ацэнку сытуацыі”.

Гэтак, захоўваліся нізкаэфэктыўныя аграрны й прамысловы сэктары, падтрымлівалася жытловае будаўніцтва, хоць яно вымагала вялікіх фінансавых рэсурсаў. У выніку ўнутраная інфляцыя і тэмпы зьніжэньня абменнага курсу беларускага рубля ў 1993—1994 гг. дагягнулі астранамічных памераў (больш чым у 20 разоў штогод). Такім чынам, праблема існаваньня самастойнай грашовай сыстэмы не была вырашана да канца, у той час як іншыя краіны былога СССР, выключаючы хіба Таджыкістан, вырашылі яе ў першыя год-два незалежнасьці.

Больш удалым быў пэрыяд з восені 1994 году па восень 1995 году. У той

час максымальна выкарыстоўваліся рынкавыя інструмэнты рэгуляваньня рублёвай грашовай масы і абменнага курсу беларускага рубля. Былі вызначаныя высокія дадатныя стаўкі працэнта па ўсіх рублёвых фінансавых інструмэнтах пры стаўцы рэфінансаваньня Нацыянальнага банку да 480% гадавых, адбылося сьціскаўне грашовай масы за кошт высокіх нормаў абавязковага рэзэрваваньня й скарачэньня тэмпаў крэдытнай эмісіі. Хутка зьнізіўся ўзровень інфляцыі, а насельніцтва й бізнэс пачалі з даверам ставіцца да дзеяньняў Нацыянальнага банку краіны. Пачаў функцыянаваць валютны рынак, які дазволіў кожнаму суб’екту гаспадараньня і кожнаму грамадзяніну свабодна, без дыскрымінацыі і ўдзелу дзяржаўных урадоўцаў, абменьваць нацыянальную валюту на ўсялякую іншую і наадварот, што моцна ўдарыла па валютных спэкулянтах і карупцыянэрах. З 1 ліпеня 1995 году быў цалкам скасаваны абавязковы продаж валютнай выручкі.

У сярэдзіне 1995 г. валютныя рэзэрвы Нацыянальнага банку выраслі прыкладна ў 20 разоў і склалі на 1 жніўня 223 млн. даляраў, рублёвыя ашчаджэньні насельніцтва павялічыліся за год у 10 разоў, інфляцыя скарацілася ў 7 разоў — з 2100% у 1994 да 344% у 1995 г. Для ўсёй эканомікі й насельніцтва быў усталяваны адзіны валютны курс, кошт аднаго даляра як афіцыйна, гэтак і на рынку стаў стабільным. У верасьні таго ж году МВФ выдаў Беларусі першы і апошні транш крэдыту “стэнд-бай”. Да таго ж, краіна атрымлівала на вельмі выгадных умовах крэдыт ад Міжнароднага банку рэканструкцыі й разьвіцьця.

Але рынкавы грашова-крэдытны сэктар блага спалучаўся зь нерэфармаванай дзяржаўнай уласнасьцю ў рэальным сэктары. Пачынаючы з восені 1995 году, асабліва пасьля ўказу прэзыдэнта пра аб’яднаньне Ашчаднага банку з АКБ “Беларусбанк”, які зьмяшчаў таксама даручэньне аб падрыхтоўцы новага Банкаўскага кодэксу і захадаў па ўзмацненьні дзяржаўнага рэгуляваньня банкаўскай дзейнасьці, пачаўся адплыў валюты з краіны, а попыт на яе на ўнутраным рынку істотна перавысіў прапанову. Нацыянальны банк, які фактычна пазбавіўся самастойнасьці, не пайшоў на дэвальвацыю рубля і стаў рабіць валютныя інтэрвэнцыі на ўнутраным грашовым рынку. Са жніўня па сьнежань 1995 году было прададзена прыкладна 120 млн. даляраў. Прычым продаж валюты адбываўся на фоне пераходу працэнтных ставак на адмоўны ўзровень, а таксама ўва ўмовах пачатку фінансаваньня будаўніцтва жытла за кошт крэдытнай эмісіі (у сьнежні быў падпісаны ўказ прэзыдэнта аб выдзяленьні на гэтыя мэты 2 трлн. беларускіх рублёў са сродкаў Нацыянальнага банку).

Зь вяртаньня ўвосень 1995 г. да нярынкавых мэтадаў у грашова-крэдытнай палітыцы і рэстаўрацыі простага дзяржаўнага кіраваньня пачынаецца трэці этап у грашова-крэдытнай палітыцы Беларусі. У лістападзе таго ж году Міністэрства эканомікі падрыхтавала пералік тавараў “крытычнага імпарту”: купляць валюту на біржы для набыцьця гэтых тавараў забаранялася. З гэтага пачынаецца і ганебная практыка існаваньня некалькіх валютных курсаў. Спачатку Нацбанк намагаўся спыніць гэты працэс і ў лютым 1996 году забараніў





адхіленьне абменных курсаў пазабіржавага рынку ад афіцыйнага курсу, аднак гэта спарадзіла мноства розных схемаў адыходу ад гэтай нормы.

У траўні-чэрвені 1996 г. быў прыняты шэраг прэзыдэнцкіх указаў па рэгуляваньні банкаўскай дзейнасьці і валютным кантролі, якія значна абмежавалі свабоду банкаў. Каб вырашыць праблему неплацяжоў, была зроблена спроба пры дапамозе грашова-крэдытнай экспансіі падвысіць каэфіцыент манэтызацыі эканомікі. Вынік атрымаўся адваротны. Неплацяжы ўзрасьлі, а каэфіцыент манэтызацыі яшчэ болей зьнізіўся. Намінальны рост рублёвай грашовай масы прывёў да зьніжэньня каэфіцыенту манэтызацыі з 10—12% да 5%, што сьведчыла аб падзеньні вартасьці грошай. (У нізкаінфляцыйных эканоміках гэты каэфіцыент вагаецца ў дыяпазоне 50—80%.) Хуткасьць абарачэньня грошай перавышала дзесяць абаротаў у год, тым часам у Нямеччыне гэтая хуткасьць не перавышае двух абаротаў. Рэальная грашовая маса (у даляравым эквіваленце), што абслугоўвае плацежнае абарачэньне, пачала імкліва скарачацца.

Адначасова была цалкам адноўленая практыка крэдытнай эмісіі Нацыянальнага банку для фінансаваньня жытловага будаўніцтва і рэальнага сэктару, у тым ліку АПК, — гэта называлі “рацыянальнай крэдытнай эмісіяй” у рэальны сэктар. Лічылася, што крэдытаваньне будаўніцтва жытла не павялічвае інфляцыі. Камэрцыйныя банкі прымушалі накіроўваць кароткатэрміновыя рэсурсы ў доўгатэрміновыя ўкладаньні пад адмоўныя стаўкі. За кошт безрэсурснай крэдытнай эмісіі, якая цягнула за сабой агромісты інфляцыйны падатак на грамадзянаў, фінансавалася празь бюджэт праграма жытловага будаўніцтва. Пры гэтым крэдыты на будаўніцтва выдавалі па льготнай стаўцы 5% гадавых (у той час як сярэднямесячная інфляцыя складала 7—11%) і на доўгія тэрміны (да 40 гадоў). Як выказаўся экс-кіраўнік Нацбанку Беларусі Станіслаў Багданкевіч, “фактычна вузкае кола забудоўшчыкаў ускосна субсыдавалася за кошт астатняга насельніцтва праз інфляцыйны падатак”.

У пачатку 1997 году, пасьля таго як чыстыя валютныя актывы Нацбанку скараціліся да $60 млн., была зробленая першая спроба ліквідаваць разрыў паміж афіцыйным і рынкавым абменнымі курсамі за кошт зьніжэньня афіцыйнага курсу. Але вельмі хутка цэнтральны банк ад гэтай ідэі адмовіўся. Замест гэтага ён паспрабаваў прыцягнуць дадатковую валюту на ўнутраны рынак, для чаго ў чэрвені 1997 г. упершыню ўвялі дадатковую сэсію на валютнай біржы з больш рэальным курсам, а таксама ўпершыню было дазволена адхіленьне курсаў у абменных пунктах ад афіцыйнага.

Праз год дзеяньні для выпраўленьня “няправільных” паводзінаў беларускага рубля актывізаваліся. У сакавіку 1998 г. пасьля рэзкага падзеньня абменнага курсу нацыянальнай валюты на вонкавых валютных рынках, у прыватнасьці на Маскоўскай валютнай біржы, сумеснай пастановай Савету міністраў і Нацыянальнага банку № 437 ад 21.03.1998 г. была прынята праграма неадкладных захадаў па стабілізацыі валютнага рынку. Сярод

вынікаў рэалізацыі гэтай праграмы — поўнае вывядзеньне з вонкаваэканамічнага плацежнага абарачэньня беларускага рубля, спыненьне яго каціровак Банкам Расіі ды рэзкае пашырэньне аб’ёму гандлю за наяўную валюту ўва ўнутранай гандлёвай сетцы. А зь верасьня 1998 г. у зьвязку зь фінансавым крызысам у Расіі быў фактычна зачынены ўнутраны міжбанкаўскі валютны рынак, а ўсе апэрацыі па куплі-продажы валюты засяродзіліся на валютнай біржы.

Аднак дадатных вынікаў гэта не дало. Адмоўны гандлёвы балянс за 1998 г. дасягнуў 1,5 млрд. руб., чыстыя валютныя рэзэрвы Нацыянальнага банку ўпалі ў канцы году да $17 млн. У тым жа 1998 г. канчаткова аформілася шматлікасьць абменных курсаў, найбольш значнымі і часта ўжывальнымі былі: афіцыйны курс, безнаяўны пазабіржавы (рынкавы), наяўны ў абменных пунктах, наяўны на “ценявым рынку”, нерэзыдэнцкі (па каціроўках замежных банкаў, у тым ліку Цэнтральнага банку Расіі ў другой палове 1999 г.), а таксама курс, які вызначаў Нацбанк на дадатковай сэсіі валютнай біржы.

Пры канцы 1998 г. была зроблена яшчэ адна спроба адміністрацыйнай лібэралізацыі валютнага рынку з мэтай стварэньня яго дадатнага іміджу у вачах прадстаўнікоў МВФ, зь якімі пасьля даволі доўгага перапынку зноў распачаліся перамовы аб супрацоўніцтве. Быў больш чым удвая дэвальваваны беларускі рубель і адноўлены пазабіржавы рынак. Але ў той жа час атрымала пашырэньне і практыка “тэлефоннага права”, калі адначасова з дазволам пазабіржавых апэрацыяў кіраўнікоў камэрцыйных банкаў запрашалі ў Нацбанк і там ім тлумачылі, “што і як робіцца насамрэч”. У гэтых час пачынаецца прымусовае крэдытаваньне камэрцыйнымі банкамі розных дзяржпраграмаў, асабліва ў АПК, якое ў 2001 г. напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў дасягнула свайго апагею. Зь верасьня па сьнежань 1999 г. пазабіржавы рынак зноў быў зачынены.

Неабходнасьць стварэньня нармальных умоваў для працы эканомікі абумовіла зьмяненьне манэтарнай і валютнай палітыкі. Курс на рэальную стабілізацыю грашовага абарачэньня быў прыняты толькі ў 2000 г. Усё пачалося з тэлеграмы Нацбанку № 31-06 ад 3.12.1999 г. , якая скасавала ўсе ранейшыя забароны. Быў адноўлены пазабіржавы рынак, зьнятыя ўсе абмежаваньні на рынку наяўнай валюты, адменены абавязковы продаж валютнай выручкі абменных пунктаў, спыненьне выдачы ліцэнзіяў на розьнічны гандаль унутры краіны. Цягам сьнежня 1999 г. — студзеня 2000 г. былі выведзеныя на рынкавы ўзровень абменныя курсы на нерэзыдэнцкім рынку і на дадатковай сэсіі валютнай біржы.

Адбылося гэта не без дапамогі МВФ і Цэнтрабанку Расіі, зь якім беларускі ўрад і Нацбанк у канцы 1999 г. падпісалі адпаведнае пагадненьне. У кастрычніку 2000 г. нарэшце адбываецца ўніфікацыя абменных курсаў нацыянальнай валюты, Нацбанк скарачае памеры крэдытнай эмісіі. Афіцыйна абвешчаны ўзровень стаўкі рэфінансаваньня стаў дадатным, практыка ўсталяваньня, за асобнымі выняткамі, адмоўных ставак па дэпазытах і крэдытах спынілася. Актывізаваліся стабілізацыйныя захады па





“замарожваньні” сродкаў банкаў у дэпазытах Нацбанку, павышаныя абавязковыя рэзэрвовыя патрабаваньні. Ува ўмовах інфляцыі й увядзеньня дадатных ставак па дэпазытах зьявілася тэндэнцыя рэвальвацыі беларускага рубля да замежных валютаў, то бок індэкс росту цэнаў істотна адставаў ад зьніжэньня абменнага курсу.

Аднак працэс стабілізацыі беларускага рубля на гэтым не завершыўся. Памеры крэдытнай эмісіі Нацбанку заставаліся вельмі значнымі, у шмат разоў перавышалі рэальны рост ВУП, што правакавала інфляцыю. Шматлікія адмыслоўцы канстатуюць, што краіна і цяпер жыве не па сродках. У 2001 г. Нацбанк крэдытаваў дзяржаўны бюджэт для фінансаваньня жытловага будаўніцтва, на кампэнсацыю ўкладаў насельніцтва і пакрыцьця бюджэтнага дэфіцыту, у тым ліку й на набыцьцё на першасным рынку дзяржаўных каштоўных папераў. Прычым ува ўмовах інфляцыі гэтыя крэдыты выдаваліся на беспрацэнтнай аснове альбо пад адмоўныя мінімальныя працэнтныя стаўкі.

Нягледзячы на абвяшчэньне дадатных ставак, у першым паўгодзьдзі 2001 г. рэальная фактычная месячная стаўка рэфінансаваньня складала ў сярэднім мінус 2,4%. Нацыянальны банк выдаў ураду эмісійныя крэдыты: у 2000 г. — на суму 122,4 млрд. руб., альбо амаль 70% усяго аб’ёму эмісіі, за першае паўгодзьдзе 2001 г. — 103,6 млрд. руб., альбо, адпаведна, 90%. Апроч таго, дзеля падтрыманьня стратных і нізкарэнтабэльных прадпрыемстваў праводзілася крэдытная экспансія. Гэтак, пры росьце ВУП за 2000 г. на 5,8% крэдыты камэрцыйных банкаў эканоміцы павялічыліся ў 3,3 разу і склалі на канец году амаль 1,5 трлн. рублёў. Такі неадпаведны рост крэдытаў і грашовай масы паспрыяў росту спажывецкіх коштаў за 2000 г. больш чым у два разы.

Тэндэнцыя захавалася і ў 2001 г.: цэны падвысіліся амаль у паўтара разу, хоць кіраўніцтва краіны і намагалася гэта пераадолець. Год пачаўся з даволі высокай інфляцыі — 6,7% за студзень. Увесну і ўлетку яе зьбілі да 2—3%, а ў жніўні, якраз напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў, інфляцыя была ўжо рэкордна нізкай — 0,9%. Зрэшты, тады кошты зацуглялі выключна адміністрацыйнымі мэтадамі: прадпрыемствам забаранілі ўздымаць цэны. Аднак пасьля выбараў усё вярнулася на свае месцы. У кастрычніку спажывецкія цэны выраслі больш чым на 3%, падвышэньне заробкаў бюджэтнікам (за два тыдні да гэтага Нацбанк выпусьціў у абарачэньне яшчэ 20 млрд. руб.) паспрыяла таму, што ў студзені 2002 г. Беларусь вярнулася амаль да тых жа паказьнікаў па інфляцыі, зь якіх пачынала 2001 г. Гэта пры тым, што сёлета прадугледжваецца яшчэ больш жорсткая грашова-крэдытная палітыка: за год інфляцыя не павінна перавысіць 20—28%. Зрэшты, толькі па выніках студзеня і лютага 2002 г. інфляцыя склала ўжо 10%, то бок амаль палову ад запланаванага, што вымушае скептычна глядзець на прагнозы ўрадавых эканамістаў. Сапраўды, ніякіх перадумоваў, нават штучных, для стабілізацыі беларускага рубля і спыненьня росту цэнаў у Беларусі на сёньняшні дзень няма. Крэдытная эмісія будзе працягвацца хаця б дзеля кампэнсацыі бюджэтнага дэфіцыту, які з

самага пачатку складаў амаль 350 млрд. руб. Праўда, міністар фінансаў Мікалай Корбут неаднаразова заяўляў, што сёлета 500 млрд. руб. будуць прыцягнутыя з "дадатковых крыніцаў" і, такім чынам, дэфіцыт бюджэту зьнікне. У зьвязку з гэтым асаблівыя надзеі ўскладаюцца на прыбыткі ад прыватызацыі (100 млрд., згодна з плянам) ды замежныя інвэстыцыі. Але апошнія не прыходзяць імгненна, а праблемы грашова-крэдытнай палітыкі вырашаць трэба ўжо цяпер.

Задача падвышэньня каэфіцыенту манэтызацыі й скарачэньня хуткасьці абарачэньня грошай вырашаецца шляхам паляпшэньня якасьці грашовай масы: павелічэньнем долі тэрміновых, асабліва доўгатэрміновых — звыш году — дэпазытаў і адпаведным зьмяншэньнем наяўных грошай і дэпазытаў "да запатрабаваньня". Пачынаючы з 2000 г., захоўваньне ашчаджэньняў на тэрміновых дэпазытах у нацыянальнай валюце стала выгаднейшым, чымся ў замежнай. Гэтак, у першым паўгодзьдзі 2001 г. сярэднія працэнтныя стаўкі па зноў прыцягнутых дэпазытах складалі: у нацыянальнай валюце для фізычных асобаў — намінальная 80—100%, рэальная месячная — -4,4-4,8%, у замежнай валюце — намінальная 10,4%, рэальная месячная ад мінус 0,8% да плюс 0,9%. Але гэта — часовы захад, заклiканы "сьцягнуць" рублёвую грашовую масу. Між тым насельніцтва, жадаючы "разбагацець" на працэнтах, забясьпечыла рост тэрміновых укладаў у пяць разоў. Калі рэальная стаўка дэпазытарнага працэнту стане адмоўнай, насельніцтва пачне канвэртаваць рублі ў даляры, што канчаткова разваліць фінансавую сыстэму. Калі ж рэальны працэнт будзе дадатным, то крэдыты для рэальнага сэктару эканомікі стануць занадта дарагімі.

Праводзячы наагул самастойную грашова-крэдытную палітыку, беларускія ўлады між тым не адмаўляліся ад ідэі стварэньня валютнага саюзу з Расіяй, а пасьля падпісаньня 2 красавіка 1996 г. Дамовы аб стварэньні Супольнасьці Беларусі й Расіі пачалі ўвасабляць гэтую ідэю ў жыцьцё. Гэтак, у артыкуле 7 Дамовы былі замацаваныя ў якасьці забавязаньняў дзьвюх дзяржаваў правядзеньне ўніфікацыі грашова-крэдытнай сыстэмы і стварэньне ўмоваў для ўвядзеньня супольнай валюты. Дадаткова прынялі Праграму сынхранізацыі й адзінай накіраванасьці эканамічных рэформаў у Беларусі й Расійскай Фэдэрацыі, якая была зацьверджана пастановай Найвышэйшай Рады Супольнасьці Беларусі й Расіі.

У Дамове аб стварэньні Саюзу Беларусі й Расіі ад 2 красавіка 1997 г. таксама было пазначана, што ўдзельнікі Саюзу павінны праводзіць адзіную грашова-крэдытную палітыку, ды абгрунтоўвалася неабходнасьць увядзеньня адзінай валюты. Пытаньні ўніфікацыі валютнага рэгуляваньня й грашова-крэдытных сыстэмаў былі рэглямэнтаваныя і Дэклярацыяй аб далейшым аб'яднаньні дзьвюх дзяржаваў. Але, па сутнасьці, усе тры гэтыя дакумэнты ні да якіх рашучых дзеяньняў у сфэры валютнай інтэграцыі ні Расію, ні Беларусь не абавязвалі. У наступныя два гады з абодвух бакоў гучалі амаль фантастычныя прапановы па аб'яднаньні грашовых сыстэмаў. Тагачасны





старшыня Цэнтрабанку РФ заяўляў пра гатовасьць Расіі перайсьці на новую валюту ўжо ў канцы 1999 г. і настойваў на абарачэньні расійскага рубля на тэрыторыі Беларусі. Прадугледжвалася, што да сакавіка 1999 г. міністэрствы фінансаў і цэнтральныя банкі дзьвюх краінаў павінны падрыхтаваць і падаць на разгляд Найвышэйшай рады Саюзу прапановы аб паэтапным увядзеньні цягам 1999 г. адзінай валюты і фармаваньні адзінага эмісійнага цэнтру. Аднак, нягледзячы на ўсе гучныя дэклярацыі, і Расія, і Беларусь увайшлі ў 2000 г. са сваімі ўласнымі валютамі, ні на крок не наблізіўшыся да стварэньня супольнага эмісійнага цэнтру.

Больш канкрэтыкі ў пытаньні пераходу на адзіную валюту несла Праграма дзеяньняў Рэспублікі Беларусі й Расійскай Фэдэрацыі па рэалізацыі Дамовы аб стварэньні Саюзнай дзяржавы ад 8 сьнежня 1999 г. Пункт 1.3 Праграмы вызначаў пералік асноўных захадаў для сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця з выкарыстаньнем адзіных паказьнікаў і індыкатараў дзяржаўнага рэгуляваньня эканомікі. У грашова-крэдытнай палітыцы гэта тычылася пытаньняў абменнага (рынкавага) курсу, тэмпаў зьмяненьня сукупнай грашовай масы, у тым ліку рублёвай, стаўкі рэфінансаваньня, працэнтных ставак па дэпазытах і крэдытах для насельніцтва і суб'ектаў гаспадараньня, а таксама ўзроўню абавязковых рэзэрвовых патрабаваньняў да камэрцыйных банкаў.

Артыкулы 13 і 22 Дамовы прысьвечаныя рэглямэнтацыі палажэньняў аб грашовай інтэграцыі Саюзнай дзяржавы, якая будзе ажыцьцяўляцца шляхам паэтапнага ўвядзеньня адзінай грашовай адзінкі пры адначасовым фармаваньні адзінага эмісійнага цэнтру. Да яго зьяўленьня на тэрыторыі дзяржаваў-удзельніцаў працягваюць абарачэньне іхныя нацыянальныя грашовыя адзінкі, а затым уводзіцца адзіная валюта, прычым паралельнае абарачэньне нацыянальных валютаў не дапускаецца. Рэалізацыю ўсіх захадаў для стварэньня адзінай грашовай адзінкі першапачаткова плянавалася завяршыць 1 студзеня 2005 г. — акурат тады адзіная валюта павінна замяніць беларускія і расійскія рублі.

У пачатку 2000 г. зьявіўся плян захадаў па ўвядзеньні адзінай грашовай адзінкі, які, у прыватнасьці, прадугледжваў ліквідацыю шматлікасьці курсаў беларускага рубля, зьняцьце ўсіх абмежаваньняў на правядзеньне разьлікаў у нацыянальных валютах паміж рэзыдэнтамі Расійскай Фэдэрацыі й Рэспублікі Беларусі па бягучых апэрацыях, ажыцьцяўленьне шэрагу іншых захадаў для стабілізацыі беларускага рубля. А 30 лістапада 2000 г. было падпісана пагадненьне "Аб увядзеньні адзінай грашовай адзінкі і фармаваньні адзінага эмісійнага цэнтру Саюзнай дзяржавы", якое да траўня 2001 г. прайшло ўсе стадыі ратыфікацыі заканадаўцамі абедзьвюх краінаў. Пагадненьне прадугледжвала дасягненьне ў грашова-крэдытнай сфэры найважнейшых макраэканамічных паказьнікаў, у тым ліку плацежных балянсаў, неабходных для ўвядзеньня расійскага рубля ў якасьці адзінага законнага плацежнага сродку на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы. Пагадненьне канчаткова зацьвердзіла й тэрміны пераходу на новую валюту — 1 студ-

зеня 2008 г. А да гэтага — з 1 студзеня 2005 г. — беларускія рублі замяняюцца на расійскія.

У хуткім часе пасьля падпісаньня гэтага дакумэнту 29 сьнежня 2000 г. урады дзьвюх краінаў падпісалі Пагадненьне аб выдачы Рэспубліцы Беларусі дзяржаўнага крэдыту. У выніку Беларусь атрымала крэдыт у памеры $30 млн. — для забесьпячэньня збалянсаванасьці разьлікаў ува ўзаемным гандлі. Пагадненьнем паміж урадам Расіі, расійскім Цэнтрабанкам, урадам Беларусі й беларускім Нацбанкам была прадугледжана выдача Беларусі крэдыту ў суме да $100 млн., у тым ліку ў 2001 г. — да $70 млн. Адначасова Нацбанк абавязаўся сфармаваць стабілізацыйны валютны фонд, часткай якога меў стаць крэдыт Цэнтрабанку Расіі ў памеры 4,5 млрд. RUR. Выдача гэтых крэдытаў павінна афармляцца асобнымі пагадненьнямі. Але дамоўленасьць гэтак і засталася на паперы: ні ў 2001 г., ні ў пачатку 2002 г. Беларусь не атрымала ад Расіі ніводнага даляра.

Аднак размовы аб адзінай валюце і адзіным эмісійным цэнтры працягваюцца. Заўважым, што ў адрозьненьне ад дамовы, якую ў 1994 г. падпісаў прэм'ер Кебіч, пагадненьне 1999 г. усё ж прадугледжвае стварэньне адзінага эмісійнага цэнтру, а ня простую ліквідацыю Нацбанку й аўтаматычны пераход на расійскі рубель.

Дзеля чаго кіраўніцтва нашай краіны гэтак упарта налягае на ўвядзеньне адзінай валюты? Размовы аб эканамічнай інтэграцыі з Расіяй, у тым ліку і аб увядзеньні адзінай валюты, пачаліся ў тыя часы, калі былі сапсаваныя адносіны з Захадам і з уплывовымі міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі, у тым ліку з МВФ. Надзея на атрыманьне крэдыту ад фонду ня спраўдзілася і ў 1999 г., калі гэтыя адносіны пачалі паляпшацца. У 2001 г. з 1 красавіка па 30 верасьня МВФ ладзіў у Беларусі праграму маніторынгу эканомікі. У выпадку беззаганнага выкананьня ўсіх патрабаваньняў фонду Беларусь магла б разьлічваць на атрыманьне крэдыту "стэнд-бай", аднак ён выдзелены ня быў.

Кіраўнік прадстаўніцтва МВФ у Літве й Беларусі Марк Хортан, ацэньваючы вынікі праграмы маніторынгу, адзначыў, што нашай краіне ўдалося дасягнуць значных посьпехаў у грашова-крэдытнай палітыцы (у паўтара разу ў параўнаньні з 2000 г. зьнізіўся ўзровень інфляцыі, замарудзіліся тэмпы абясцэньваньня нацыянальнай валюты, зьменшыўся аб'ём эмісіі й г.д.), аднак у бюджэтнай сфэры ёсьць значныя вады. Прадстаўнікі МВФ патрабавалі празрыстасьці бюджэту і крытыкавалі ўрад за тое, што бюджэты асобных ведамстваў застаюцца "закрытымі". Сумы, якія туды ідуць, настолькі вялікія, што ня ўлічваць іх немагчыма. Да таго ж, МВФ засьцерагаў урад ад падвышэньня заробкаў бюджэтнікам.

Беларускія ўлады адрэагавалі на крытыку балюча і палічылі яе несправядлівай. Ад новай праграмы маніторынгу МВФ урад адмовіўся. І зноў павярнуўся да Расіі. Як згадвалася вышэй, у канцы 2000 г. было падпісана пагадненьне аб выдачы Беларусі крэдыту ў суме да $100 млн. Пагадненьне аб уласна валютным аб'яднаньні яшчэ не было ратыфікавана, а пра крэдыт пасьпелі ўжо дамовіцца. Але ў 2001 г. грошай ад Расіі Беларусь не дачакала: у канцы





мінулага году, якраз пасьля заканчэньня праграмы маніторынгу МВФ, Менск наведала працоўная група прадстаўнікоў Мінэканомікі РФ, якая ацэньвала стан беларускай гаспадаркі і давала парады па рэфармаваньні. Патрабаваньні, якія вылучылі расійцы, куды больш жорсткія, чым умовы фонду, аднак беларускі бок на іх пагадзіўся, альбо зрабіў выгляд, нібы згодны.

Беларускі рэжым нарэшце пачынае ўсьведамляць, што дачыненьні з Расіяй эпохі Ельцына, калі можна было дамагчыся некаторых істотных выгодаў, не заплаціўшы па ўсіх рахунках, адыходзяць у нябыт. Няма дзіва, што набліжаныя да ўладаў эканамісты апошнім часам мяняюць сваё стаўленьне да пэрспэктываў валютнага саюзу Беларусі й Расіі. Гэтак, усяго год таму дэкан эканамічнага факультэту БДУ прафэсар Міхаіл Кавалёў у інтэрвію газэце "Рэспубліка" цьвердзіў, што пераходзіць на расійскія рублі можна "ўжо цяпер". А нядаўна ён заявіў, што з увядзеньнем адзінай валюты "ня варта сьпяшацца". Ці не зьвязаная гэта перамена ў поглядах з расчараваньнем у ідэі грашовай інтэграцыі і ці ня скончыцца ўсё гэтакім жа чынам, як і ў 1994 годзе?